**«НАШЫХ ДЗЕДАЎ ДУШЫЛІ АБШАРЫ ЛЯСОЎ…»**, верш Б. Датуецца 1912. Змешчаны ў цыкле «Думы», вершы якога знітаваны роздумам паэта над лёсам роднага краю. Літаральны сэнс верша звязаны з гісторыяй пра тое, як продкі беларусаў («нашы дзеды») рассяляліся па бел. землях, вызваляючы яе ад непралазных лясных пушчаў («абшары лясоў», «тыя пушчы»). Затым яны засявалі папялішчы — «А на попеле буйна ўзраслі каласы», і жыццё на адваяванай у леса зямлі наладжвалася. Верш мае шматзначны сімвалічны сэнс. Сімволіка вобразаў скіроўвае агульнае гучанне верша ў сац.-паліт. кірунку: калі людзей «душылі абшары лясоў», як цёмная змрочная сіла, тады «нашы дзеды», «дзеды суворыя» змагаліся з гэтай сілай агнём («звадзілі агнём»). Паэт верыць у пераемнасць пакаленняў, у тое, што прыклад «дзедаў суворых» навучыць нас «не хіліцца з бяды, не пужацца агня», жыць «праўдзівым жыццём», быць здольнымі «на змаганне». І гэты вобраз мужнага змагання «нашых дзедаў» упэўнівае паэта ў тым, што і «мы толькі тады дачакаемся дня, // Калі нас не здалее змаганне злякаць». Новы вобразны сэнс верша пралягае і ў асветніцкім кірунку яго прачытання: раней над людзьмі панавала цемра. Але змаганне з ёю прынесла святло «сонца» — «І святлей і прасторней тады стала жыць». Гэты ўзровень прачытання вобразаў верша адпавядае запаветнай мары Б. пра неабходнасць асветы, пра вызваленне чалавека і яго думак ад прыгнету. Спалучэнне розных вобразных пластоў было ўласціва сярэдневяковай паэтыцы. Паэт аднаўляе шматзначнае, шматсэнсавае напаўненне маст. структуры паэт. вобразаў.

Упершыню — «Вянок».

*Г.Я.Адамовіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ